# ЧАСТЬ 3
# ПРОБЛЕМЫ ЭТНОЛОГИИ, АНТРОПОЛОГИИ, ФОЛЬКЛОРИСТИКИ И СЛАВИСТИКИ

***Аўсейчык У.Я.***
*(Рэспубліка беларусь, г. Наваполацк)*

## СТАРАВЕРЫ ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1920–1930-Я ГГ.: АСАБЛІВАСЦІ РАССЯЛЕННЯ І ДЫНАМІКА КОЛЬКАСЦІ

Тэрыторыя паўночна-заходняй Беларусі з’яўляецца месцам кампактнага пражывання рускіх старавераў, якія пасяляюцца на гэтых землях з сярэдзіны XVII ст. Рэгіён з’яўляецца адным з асноўных цэнтраў стараверства на беларускіх землях. Такая сітуацыя характэрна як у мінулым, так і ў сучасны перыяд. Менавіта ў паўночна-заходняй частцы Беларусі знаходзіцца большасць стараверскіх абшчын у наш час. Нягледзячы на гэта, у беларускай гуманітарыстыцы гісторыя і культурныя традыцыі старавераў у гэтым рэгіёне даследаваны не дастаткова [1]. У айчыннай і замежнай навуцы адсутнічаюць комплексныя работы аб старaверах на заходнебеларускіх землях у міжваенны перыяд. І калі яшчэ па традыцыйнай культуры стараверства ў рэгіёне ў адзначаныя храналагічныя межы існуе некалькі публікацый, то асаблівасцям рассялення і дэмаграфічным працэсам не было прысвечана належнай увагі.

Храналагічныя рамкі даследавання ахопліваюць 1920–1930-я гг., якія лічацца дастаткова спрыяльнымі ў развіцці стараверскай супольнасці ў паўночна-заходняй частцы Беларусі. У адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам у гэты перыяд рэгіён даследавання будуць складаць беларускія землі Віленскага ваяводства (да 1925 г. мела назву Віленскай зямлі) у складзе Польшчы. Крыніцамі для даследавання стаў комплекс статыстычных даных, апублікаваныя і архіўныя матэрыялы.

Першыя даныя аб колькасці старавераў на беларускіх землях пасля Першай сусветнай вайны дае перапіс насельніцтва, які быў праведзены ў снежні 1919 г. на т.зв. “усходніх землях Польшчы”. Гэтыя тэрыторыі знаходзіліся пад кіраўніцтвам Грамадзянскага ўпраўлення Усходніх земляў (Zarz№d Cywilny Ziem Wschodnich). Беларускія землі былі ўключаны ў тры акругі: Віленскую (Віленскі, Троцкі, Ашмянскі, Свянцянскі, Лідзкі, Гродзенскі, Навагрудскі, Браслаўскі, Дзісенскі паветы), Брэсцкую (Брэсцкі, Ваўкавыскі, Пружанскі, Слонімскі, Кобрынскі, Пінскі,

Мазырскі паветы), Мінскую (Мінскі, Бабруйскі, Барысаўскі, Слуцкі і Ігуменскі паветы) [7, s. 64]. Як сведчаць даныя перапісу 1919 г., у межах Віленскай, Брэсцкай і Мінскай акруг налічвалася 33 018 старавераў, што складала каля 0,85% ад усяго насельніцтва гэтых трох акруг. Лідарам па колькасці стараверскага насельніцтва з'яўлялася Віленская акруга. На яе тэрыторыі пражывала 27 224 стараверaў, што складала 1,67% ад усяго насельніцтва акругі [5]. У Табліцы 1 прадстаўлена размеркаванне стараверскага насельніцтва па яе паветах.

**Табліца 1 – Размеркаванне стараверскага насельніцтва па паветах Віленскай акругі (1919 г.)**

| Павет | Колькасць стараверaў, чал. | Доля стараверaў ад усяго насельніцтва павета, % |
|---|---|---|
| Браслаўскі | 9 346 | 11,33 |
| Дзісенскі | 9 043 | 4,68 |
| Свянцянскі | 4 930 | 3,53 |
| Віленскі | 1 636 | 0,89 |
| Г. Вільня | 378 | 0,29 |
| Вілейскі | 894 | 0,42 |
| Лідзкі | 526 | 0,28 |
| Троцкі | 323 | 0,35 |
| Ашмянскі | 140 | 0,07 |
| Гродзенскі | 8 | - |
| Навагрудскі | - | - |

Складзена аўтарам на аснове [5].

На тэрыторыі Віленскай акругі найбольшая колькасць стараверaў была зафіксавана ў Браслаўскім і Дзісенскім паветах. Браслаўскі павет быў утвораны з часткі былога Новааляксандраўскага павета Ковенскай губерні і Ілукштанскага павета Курляндскай губерні. А таму значная яго частка не ўваходзіць у сучасныя межы Беларусі. Ужо ў ліпені 1920 г. землі былога Ілукштанскага павета былі перададзены ў склад Латвіі. Разам з тым і ўсе землі былога Новааляксандраўскага павета не з'яўляюцца ў сучасны перыяд беларускімі (тэрыторыямі гмін Дукшты, Смолвы, Рымшаны зараз у складзе Літвы). Уласна з усяго Браслаўскага павета да беларускіх земляў адносяцца гміны Браслаў, Відзы, Дрысвяты, Опса, Плюсы, Слабодка. Як вынікае з падлікаў, на сучасныя беларускія землі прыпадала каля 40% ад усёй колькасці стараверaў Браслаўскага павета (не перавышала 4 тыс.чалавек). Найбольшая доля стараверaў у агульным складзе насельніцтва налічвалася ў гмінах Плюсы, Слабодка і Дрысвяты. Па колькасці стараверскага насельніцтва гэтыя гміны таксама лідзіравалі. Найменшая колькасць стараверaў пражывала ў гмінах Опса і Браслаў [8, s. 37].

Лідарам па колькасці стараверaў на беларускіх землях быў Дзісенскі павет. На яго тэрыторыі найбольшая колькасць прыхільнікаў старых абрадаў пражывала ў гміне Пераброддзе (каля 3 тыс. чалавек і 36,9% ад усяго насельніцтва). Істотная колькасць таксама налічвалася ў гмінах Ёды (каля 1,5 тыс. чалавек і 11,6% ад усяго

насельніцтва), Новы Пагост (каля 1,3 тыс. чалавек і 15,4% ад усяго насельніцтва), Богін (каля 0,8 тыс. чалавек і 9,2% ад усяго насельніцтва), Друйск (каля 0,65 тыс. чалавек і 7,6% ад усяго насельніцтва), Германавічы (каля 0,45 тыс. чалавек і 5,8% ад усяго насельніцтва) [8, s. 38].

Істотная доля старавераў пражывала ў Свянцянскім павеце. Але толькі ў гмінах Гадуцішкі (большая яе частка не адносіцца ў сучасны перыяд да беларускіх земляў), Камаі, Лынтупы і Свір іх доля ў агульнай структуры насельніцтва была істотнай. А ў Вілейскім павеце старавееры пражывалі амаль выключна ў гмінах Лучай, Манькавічы, Хоценчыцы. Але іх колькасць не была вялікай [8, s. 38, s. 41].

Больш поўную і сістэмную інфармацыю аб колькасці і асаблівасцях рассялення стараверваў у Заходняй Беларусі на пачатку 1920-х гг. даюць матэрыялы перапісу 1921 г. Як вынікае з яго даных, асноўная колькасць стараверваў пражывала на тэрыторыі Віленскай зямлі (пазней – Віленскага ваяводства). На астатніх беларускіх землях, якія ўваходзілі ў склад Польшчы, у пачатку 1920-х гг. стараверваў пражывала вельмі мала. Даныя аб старавeрскім насельніцтве ў паветах Віленскай зямлі, згодна з перапісам 1921 г., прадстаўлены ў Табліцы 2.

**Табліца 2 – Размеркаванне стараверскага насельніцтва па беларускіх паветах Віленскай зямлі (згодна з перапісам 1921 г.)**

| Павет | Колькасць стараверваў | Доля стараверваў у агульнай колькасці насельніцтва, % |
|---|---|---|
| Дзісенскі | 9 638 | 5,57 |
| Браслаўскі | 5 482 | 8,75 |
| Дунілавіцкі | 719 | 0,64 |
| Вілейскі | 178 | 0,14 |
| Свянцянскі | *Перапіс не праводзіўся* | |
| Ашмянскі | *Перапіс не праводзіўся* | |

Складзена аўтарам на аснове: [10, s. VI].

На тэрыторыі Віленскай зямлі лідарам па колькасці стараверскага насельніцтва быў Дзісенскі павет. У агульнай структуры насельніцтва павета старавееры складалі каля 5,57% (Табліца 2). Лідарам па колькасці стараверваў у павеце была гміна Перабродdзе. Згодна з данымі перапісу 1921 г. на яе тэрыторыі пражывала 3 122 стараверваў, што складала 38,18% ад усяго насельніцтва гміны. Старавееры пражывалі больш чым у палове яе населеных пунктаў. Істотная колькасць стараверваў налічвалася таксама ў паўночнай і заходняй частках Дзісенскага павета (гміны Ёды, Новы Пагост, Богін, Друя, Германавічы, Чэрасы, Шаркаўшчына). Ва ўсходніх і паўднёвых землях павета прыхільнікаў старых абрадаў пражывала мала. На гэтай тэрыторыі параўнальна невялікая іх колькасць зафіксавана ў гмінах Залессе, Глыбокае і Пліса. Аднак колькасць населеных пунктаў, дзе яны налічваліся, была зусім малой. Невялікая колькасць стараверваў пражывала ў гмінах Лужкі, Мікалаёва, Стэфанполь, Мёры [10, s. 39–76].

Наступным па колькасці стараўераў быў Браслаўскі павет. Тут у 1921 г. пражывала звыш 5 тысяч чалавек, што складала каля 8,75% ад усяго насельніцтва павета. Па колькасці стараверы ў павеце саступалі толькі каталікам. Як сведчыць даныя перапісу, стараверы пражывалі ва ўсіх гмінах Браслаўскага павета. На беларускай тэрыторыі павета лідарамі па колькасці стараверау былі гміны Плюсы, Відзы, Слабодка і Дрысвяты. Па долі стараверау у агульнай структуры насельніцтва Браслаўскага павета гэтыя гміны таксама займалі лідыручыя пазіцыі. Асабліва вылучалася гміна Плюсы. У агульным складзе яе насельніцтва стараверы, згодна з перапісам 1921 г., складалі 20,92%. У Відзкай, Дрысвяцкай і Слабодскай гмінай доля стараверскага насельніцтва была ніжэйшай. У астатніх беларускіх гмінах павета колькасць стараверау была яшчэ меншай [10, s. 3–20]. У гмінах, тэрыторыя якіх не адносіцца да сучаснай Беларусі, стараверау пражывала ня шмат, Так, у гміне Дукшты налічвалася 339 стараверау, у гміне Рымшаны – 103, у гміне Смолвы – 382 [10, s.7–14].

Дунілавіцкі і Вілейскі паветы не адносіліся да ліку густазаселеных стараверскім насельніцтвам. На 1921 г. доля стараверскага насельніцтва ў агульнай структуры насельніцтва паветаў была зусім нізкай (0,64% – у Дунілавіцкім, 0,14% – у Вілейскім). Яны па колькасці саступалі каталікам, праваслаўным і іўдзеям. У Дунілавіцкім павеце стараверы пражывалі толькі ў гміне Лучай, Манькавічы, Мядзель і Паставы. У астатніх гмінах іх або ўвогуле не налічвалася, або іх колькасць была зусім невялікай. У Вілейскім павеце стараверы зафіксаваны ў гмінах Хоценчыцы, Ілля, Маладзечна, Алковічы. Але іх колькасць тут была зусім нязначнай [10, s. 78–94].

На тэрыторыі Віленскай зямлі ў 1923 г. было зафіксавана 30 стараверскіх абшчын, кожная з якіх аб’ядноўвала ад 500 да 2000 прыхажанаў: у Вільні – 1, у Свянцянскім павеце – 9, у Браслаўскім – 5, у Дзісенскім – 10, у Дунілавіцкім – 2, у Ашмянскім – 1, у Віленска-Троцкім – 2 [2, s. 266]. У першай палове 1920-х гг. некалькі павялічылася і колькасць стараверау у гэтых паветах. На 1924 г. у Віленскай зямлі пражывала 28 808 стараверау. У Дзісенскім павеце у гэты час налівалася 9 738 стараверау, у Браслаўскім – 5 562, Свянцянскім – 6 829, Дунілавіцкім – 760, Вілейскім – 188 [6, s. 456].

У Віленскім ваяводстве ў 1920–1930-х гг. пражывалі амаль выключна стараверы-беспапоўцы [2, s. 266]. У ваяводстве ў 1930-х гг. налічвалася толькі адна абшчына стараверау папоўцаў. Яна знаходзілася ў Віленска-Троцкім павеце ў Падбярэзскай гміне (в. Акмяна) і налічвала ў 1936 г. толькі 46 асоб. Таксама ў ваяводстве налічвалася ў гэтым годзе 18 стараверау-папоўцаў у Свянцянскім павеце (в. Зусіна і Геладня), а таксама 31 асоба ў Вільні [3, s. 67].

Тэндэнцыі да павелічэння стараверскага насельніцтва ў рэгіёне захоўваліся і на працягу 1930-х гг. Некаторую інфармацыю аб колькасці стараверау і месцах іх рассялення даюць даныя перапісу 1931 г. (Табліца 3). Дакладна вызначыць колькасць

стараveraў на сучасных беларускіх земляў на аснове апублікаваных даных гэтага перапісу даволі праблематычна ў сувязі з некалькімі прычынамі. Па-першае, невялікая частка Браслаўскага павета, а таксама значная частка Свянцянскага павета ў сучасны перыяд уваходзіць у склад Літвы. Па-другое, у апублікаваных даных перапісу інфармацыя аб стараверах прыведзена ў графе “іншыя хрысціянскія веравызнанні”. Праўда, як адзначалі даследчыкі, якія апрацоўвалі інфармацыю перапісу, у Віленскім ваяводстве да гэтай групы адносіліся пераважна старaверы [4, s. XI]. Як вынікае з даных перапісу 1931 г., лідарам па колькасці стараверскага насельніцтваў віленскім ваяводстве стаў Браслаўскі павет. На яго тэрыторыі пражывала больш паловы ўсіх старавераў беларускіх паветаў Віленскага ваяводства (Табліца 3). Такое хуткае павелічэнне стараверскага насельніцтва ў павеце тлумачыцца не міграцыйнымі і дэмаграфічнымі працэсамі, а пераразмеркаваннем тэрыторый паветаў у выніку адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы ў 1926 г. У выніку значная частка былога Дзісенскага павета (гміны Перабродзе, Богін, Ёды, Новы Пагост, Друйск, Мёры, Леонпаль, Чэрасы) была перададзена ў склад Браслаўскага [9, poz. 472]. Менавіта гміны Перабродзе, Богін, Ёды, Новы Пагост былі лідарамі па колькасці стараверскага насельніцтва ў Дзісенскім павеце. У выніку колькасць старавераў у Дзісенскім значна паменшылася, а ў Браслаўскім – істотна ўзрасла.

**Табліца 3 – Размеркаванне насельніцтва “іншых хрысціянскіх веравызнанняў” па паветах Віленскага ваяводства згодна з перапісам 1931 г.**

| Павет | Колькасць, чал. |
|---|---|
| Браслаўскі | 16 183 (Без уліку гарадскога стараверскага насельніцтва) |
| Свянцянскі | 8 687 |
| Дзісенскі | 2 174 |
| Пастаўскі | 1 568 |
| Ашмянскі | 757 |
| Вілейскі | 611 |
| Маладзечанскі | 215 |

Складзена аўтарам на аснове [4, s. 12].

Іншыя статыстычныя і архіўныя даныя сведчаць аб устойлівым павелічэнні стараверскага насельніцтва, а таксама колькасці іх абшчын у рэгіёне на працягу 1930-х гг. Так, згодна з данымі на 1936 г. у Віленскім ваяводстве пражывала звыш 40 тысяч старавераў, якія ўтваралі 42 рэлігійныя абшчыны (Табліца 4).

**Табліца 4 – Статыстычныя даныя аб колькасці староверскіх абшчын, храмаў, духавенства і прыхажанаў у Віленскім ваяводстве на 1936 г.**

| № | Павет | Колькасць абшчын | Колькасць храмаў | Колькасць духавенства | Колькасць прыхажан |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Браслаўскі | 18 | 18 | 17 | 19 118 |
| 2 | Дзісенскі | 4 | 4 | 4 | 2 995 |
| 3 | Ашмянскі | 3 | 2 | 2 | 815 |
| 4 | Пастаўскі | 3 | 2 | 2 | 1 665 |
| 5 | Свянцянскі | 10 | 9 | 9 | 12 187 |
| 6 | Віленска-Троцкі | 3 | 3 | 3 | 1 963 |
| 7 | Г.Вільна | 1 | 1 | 1 | 428 |
| | **Усяго** | **42** | **39** | **38** | **42 777** |

Складзена аўтарам на аснове [2, s. 326] (Як вынікае з архіўных дакументаў, прыведзеныя даныя хоць і падаюцца на 1937 г., але сабраныяў ў 1936 г. [2, s. 315, s.318–322]).

Пераважная большасць стараверау Віленскага ваяводства пражывала на беларускіх землях. У сучасных межах Беларусі на той час існавала 30 стараверскіх абшчын. Яны аб'ядноўвалі звыш 30 тыс. чалавек [2, s. 326, s. 318–322]. Геаграфія размяшчэння стараверскіх абшчын паказана на Малюнку 1. Пры падліках стараверскага насельніцтва ў сучасных межах Беларусі пэўную цяжкасць выклікае дакладнае ўстанаўленне колькасці стараверау, якія пражывалі на беларускіх землях Свянцянскага павета. Як вынікае з даных, у 1936 г. на беларускіх землях павета існавалі 4 стараверскія абшчыны ў Апідамах, Куклянах, Стрыпішках і Свіры. Колькасць прыхажанаў, аб'яднаных у гэтыя абшчыны, складала 6 009 чалавек (3 245 – Апідамы, 1 315 – Кукляны, 826 – Стрыпішкі, 623 – Свір) [2, s. 319–320].




**Мал. 1 – Карта-схема размяшчэння стараверскіх абшчын на заходнебеларускіх землях у другой палове 1930-х гг. (складзена аўтарам)**

Такім чынам, у 1920–1930-х гг. у паўночна-заходняй частцы Беларусі пражывала значная частка стараверскага насельніцтва. Гэты рэгіён з'яўляўся адным з важнейшых кампактных зон рассялення стараверау у межах Беларусі. У адзначаны перыяд ён з'яўляўся адным з лідараў на беларускіх землях як па

колькасці стараверскага насельніцтва, так і па колькасці іх рэлігійных абшчын. А дзякуючы дастаткова спрыяльным умовам для развіцця ў міжваенны перыяд у складзе Польскай дзяржавы стараверская супольнасць рэгіёна заставалася даволі масавай і ў наступныя перыяды.

**Літаратура**


1. Аўсейчык, У.Я. Гісторыя вывучэння стараавераў Паўночнай Беларусі / У.Я. Аўсейчык // Вестник ПГУ. Серия А. Гуманитарные науки. Исторические науки. – 2020. – № 1. – С. 18–32.
2. Archiwum Akt Nowych (AAN). – Zespyi 14: Ministerstwo Wyznac Religijnych i Oњwiecenia Publicznego w Warszawie. – Sygnatura 1270: Koњciyi Staroobrzкdowy nieuznaj№cy hierarchii (1922–1939).
3. AAN. – Zespyi 14: Ministerstwo Wyznac Religijnych i Oњwiecenia Publicznego w Warszawie. – Sygnatura 1272: Koњciyi Staroobrzкdowy uznaj№cy hierarchiк tzw. popowcy.
4. Drugi Powszechny Spis Ludnoњci z dn. 9. XII 1931 r. : mieszkania i gospodarstwa domowe, ludnoњж, stosunki zawodowe : wojewydztwo wilecskie. – Warszawa: Giywny Urz№d Statystyczny, 1936. – XXX, 164 s.
5. Grafik skiadu wyznaniowego narodowoњci i skiadu narodowoњciowego wyznac. Wilno: Komisariat Generalny ZCZW [Zarz№du Cywilnego Ziem Wschodnich], Centralne Biuro Spisu Ludnoњci [rкkopis]. – 1920. – 28 tabl. Электронны рэсурс. – Рэжым доступу: http://statlibr.stat.gov.pl/F?func=full-set-set&set_number=000008&set_entry=000001&format=999.
6. Januszewska-Jurkiewicz, J. Stosunki narodowoњciowe na Wileczszczyџnie w latach 1920-1939 / J. Januszewska-Jurkiewicz. – Katowice: Wydawnictwo Uniwersytetu Њl№skiego, 2010. – 710 s.
7. Jazowska, B. Spis ludnoњci na ziemiach wschodnich Rzeczypospolitej Polskiej w 1919 r. // Wiadomoњci Statystyczne. – 2019. – № 10. – S. 63–76.
8. Romer, E. Spis ludnoњci na terenach administrowanych przez Zarz№d Cywilny Ziem Wschodnich (grudziec 1919). – Lwyw-Warszawa: Ksi№їnica Polska Towarzystwa Nauczycieli Szkyi Wyїszych, 1920. – 50 s.
9. Rozporz№dzenie Rady Ministryw z dnia 26 czerwca 1925 r. o zmianie granic powiatyw na obszarze okrкgu administracyjnego wilecskiego // Dziennik Ustaw. – 1925. – № 67. – poz. 472.
10. Skorowidz miejscowoњci Rzeczypospolitej Polskiej opracowany na podstawie wynikyw Pierwszego Powszechnego Spisu Ludnoњci z dn. 30 wrzeњnia 1921 r. i innych џrydei urzкdowych. – Warszawa: nakladem glownego urzedu statystycznego, 1923. – T. 7, cz. 2: Ziemia wilecska (powiaty: Brasiaw, Duniiowicze, Dzisna i Wilejka). – 118 s.



***Андрюнина М.А.***
(*Российская Федерация, г. Москва*)


## МАТЕРИАЛЫ К ИЗУЧЕНИЮ НАРОДНОГО КАЛЕНДАРЯ: МИФОЛОГИЧЕСКИЙ ОБРАЗ ВОЛКА В ОБРЯДНОСТИ ГРОМНИЦ

В традиционной культуре связь праздника Сретения/Громниц (2/15.02) с волками обнаруживается при полевой работе без наводящих вопросов, так, на просьбу рассказать о волках информанты часто сами говорят о том, что они